Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 ЧЭРВЕНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 104 (28214) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Які дзень у цыган лепшы?

СТАР. 4




Праўдзівыя гісторыі ад чытачоў

СТАР. 13



Праграма тэлебачання на тыдзень

20 КАНАЛАЎ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй КАЎХУТА, міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:**

*«Беларусь займае 5-е месца ў Еўропе па забяспечанасці воднымі рэсурсамі: забяспечанасць воднымі рэсурсамі на душу насельніцтва ў краіне (6,1 тыс. куб.м на чалавека ў год) блізкая да сярэднееўрапейскай, але пры гэтым значна вышэйшая, чым у суседніх краінах — Польшчы (1,7 тыс. куб.м на чалавека ў год) і Украіне (4,1 тыс. куб.м). Разам з тым падземныя водныя рэсурсы размеркаваны нераўнамерна: найбольшая колькасць залягання падземных вод адзначаецца на тэрыторыі Мінскай вобласці, найменшая — на тэрыторыі Брэсцкай вобласці. Наша краіна ў перспектыве не сутыкнецца з праблемай недахопу прэсных вод. Аднак гэта не значыць, што можна бяздумна выкарыстоўваць гэтыя бясцэнныя рэсурсы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 3.06.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19921,00 | ▲ |
| Еўра | 22326,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 298,37 | ▲ |
| Укр. грыўня | 795,81 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# ПАСЛУХМЯНАЯ ЛАЗА ГАРАДОЦКАГА МАЙСТРА



**Васіль СІМАНОВІЧ жыве далёка ад сталіцы — у Гарадку Віцебскай вобласці, але кожны год майстар па лозапляценні прыязджае за 300 кіламетраў у Мінск, каб паўдзельнічаць у традыцыйным фестывалі-кірмашы «Вясновы букет» і паказаць, што ўмеюць гарадоцкія майстры.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Жыллё

# АРЭНДА НА МІНІМУМЕ

**Сталічныя эксперты жыллёвай арэнды адзначаюць, што ўжо цяпер на рынку прыватных здымных кватэр фіксуецца цэнавае дно. Кажуць, што танней ужо не будзе...**

**Звычайна прыватнае арэнднае жыллё Мінска пачынала таннець менавіта з першых дзён лета, калі павялічвалася прапанова (за кошт кватэр пенсіянераў, якія пераехалі жыць на дачы), а попыт у сезон канікул заўсёды мінімальны. Аднак ранейшыя тэндэнцыі сёння на рынку амаль не працуюць, бо цэннікі на арэнду жылля працягвалі зніжацца на працягу ўсяго года, і сёння яны ўжо дасягнулі свайго мінімуму. Пра існуючую сітуацыю на сталічным рынку ў сегменце доўгатэрміновай арэнды і прагнозы на найбліжэйшую перспектыву карэспандэнту «Звязды» паведаміла спецыяліст аддзела жыллёвай арэнды аднаго з цэнтраў гандлю нерухомасцю Алена АГРЫЗКА.**

## З'явіліся аднапакаёўкі і за 150 USD

Гэта самы мінімальны цэннік для аднапакаёвых кватэр невялікіх плошчаў у старых пяціпавярховых дамах у нялепшых мікрараёнах. Больш за тое, пустыя слабенькія




кватэры або падобнае бюджэтнае жыллё з мэбляй савецкіх часоў можа часам прапанавацца і за 140 долараў.

Алена Агрызка адзначае, што па стаўцы арэнды ў межах 150-170 долараў цяпер магчыма адшукаць стандартную аднапакаёўку з дастатковым наборам мэблі і нават са свежым касметычным рамонтам практычна ў любым раёне горада. У гэтым выпадку будучы кватарант будзе мець нават неблагі выбар з некалькіх дзясяткаў варыянтаў.

СТАР. 4

■ Падпіска-2016

# ...КАБ СКАЗАЦЬ: «ПАЕХАЛІ!»

**Жарты нічога не варты, але ж часам праўдзяцца! Спадарыня Целяшэўская з Валожыншчыны гадоў колькі таму падзялілася каштоўным досведам, напісала:**

*Я святочную яду*
*Не гатую зранку,*
*Падпішуся на «Звязду» —*
*Прынясуць да ганка...*
*Варта мужу ў рукі ўзяць,*
*На канапу сесці —*
*Калі — дзень, а калі й... пяць*
*Не пытае есці!*

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Адчуваеце, якая істотная эканомія? І пры гэтым — яшчэ не ўся! Бо кожны з індывідуальных падпісчыкаў, апроч газеты (зазначым, найстарэйшай, адзінай са штодзённых беларускамоўнай, якая выходзіць пяць разоў на тыдзень), мае шанц на выйгрыш. Сярод прызоў (гл. «Звязда» за 2 чэрвеня г.г.) — сем двухмесных палатак (на кожную вобласць ды Мінск) і веласіпед коштам, дарэчы, амаль шэсць мільёнаў рублёў! На такім, відавочна, і ў сваты можна?!

А, галоўнае, для таго, каб на ім хуценька «паехаць», доўга запрагаць не трэба, як той казаў: дастаткова афарміць падпіску (на другое паўгоддзе, квартал), запоўніць прапанаваны купон (ён будзе друкавацца да 30 чэрвеня) і даслаць яго ў рэдакцыю. А там...

Нашы продкі вучылі: дагнаў — не дагнаў, а прабегчы можна...

Каб потым (уявіце) сесці на новенькі веласіпед і...

Вам з намі па дарозе! Ці не так?